


DC COMICS
THE NEW 52!
4
$2.99
US
BATMAN
SCOTT
SNYDER
GREG
CAPULLO
JONATHAN
GLAPION
DIRECT SALES
FEB 2012
RATED T TEEN
RY COMICS


DC COMICS
THE NEW 52!
4
$2.99
US
BATMAN
SCOTT
SNYDER
GREG
CAPULLO
JONATHAN
GLAPION
CHOI
DIRECT SALES
RATED T TEEN
FEB 2012
RY COMICS



ШМАТЛІКІЯ ЛІЧУЦЬ, ШТО Ў РАСЦЯЖКАХ ГАЛОЎНУЮ ПАГРОЗУ ЎЯЎЛЯЕ САМ ВЫБУХ.
KABOOM



АДНАК НЕ.
УНННХ!
РЭАЛЬНАЯ ПАГРОЗА КРЫЕЦЦА...
...У ЯГО НАСТУПСТВАХ.
НА САМОЙ СПРАВЕ ГЭТЫЯ ПАСТКІ З'ЯЎЛЯ-ЮЦЦА ХУТЧЭЙ ПСІХАЛА-ГІЧНАЙ ЗБРОЯЙ, ЧЫМ ГВАЛТОЎНЫМ.
ЯНЫ ДЭМАРАЛІЗУЮЦЬ І ЖАХАЮЦЬ ЛЮБОГА ПАБЛІЗУ, ДАЮЧЫ ЗРАЗУМЕЦЬ, ШТО ВОРАГ ПАДРЫХТАВАНЫ ЛЕПШ ЦЯБЕ, ШТО ГЭТА ЯГО ДОМ, ШТО Ў ІМ ЁН ПАЎСЮЛЬ...
...І ГАТОВЫ НАПАСЦІ Ў ЛЮБЫ МОМАНТ.
THUM



У ГОТЭМЕ ЁСЦЬ СТАРАЯ ЛЕГЕНДА, ДЗІЦЯЧАЯ БАЙКА ПРА САВІНЫ СУД.
ПАВОДЛЕ ЁЙ, ГОРАДАМ ТАЕМНА КІРУЕ СУПОЛКА ЛЮДЗЕЙ, ЯКАЯ МАЕ ЎПЛЫЎ ПРАЗ ЗАБОЙЦУ ПА МЯНУШЦЫ КІПЦЮР...
CRASH
...ЁН ХАВАЕЦЦА НА ТАЕМНЫХ БАЗАХ СУДА, РАСКІДАНЫХ ПА ЎСЯМУ ГОТЭМУ.
УЧОРА ЎВЕЧАРЫ Я ЗНАЙШОЎ НЕКАЛЬКІ ТАКІХ БАЗ, ЯКІЯ, ВІДАЦЬ, ДЗЕЙНІЧАЛІ ЯШЧЭ З 19-ГА СТАГОДДЗЯ. ЯНЫ БЫЛІ РАЗМЕШЧАНЫ Ў БУДЫНКАХ, ПАБУДАВАНЫХ МАЁЙ СЯМ'ЁЙ, УЭЙНАМІ.
Я ЯК РАЗ ДАСЛЕДВАЎ АДЗІН З ІХ, НАЙБОЛЬШ НОВАЕ, КАЛІ АДБЫЎСЯ ВЫБУХ.
ДЗЯКУЙ БОГУ...



...МЯНЕ ЦЯЖКА СПУЖАЦЬ.
«КАЛІ ЎСЁ ГЭТА ПРАЎДА, ТАДЫ ГЭТА КАНЕЦ... САПРАЎДНЫ, І ЁН ПОБАЧ...»



«...АДНАК Я ГЭТАГА ТАК НЕ ПАКІНУ.»
«СУМЛЕННА КАЖУЧЫ, ЗАНАДТА ШМАТ РАНЕННЯЎ ДЛЯ АДНАГО ЧАЛАВЕКА ЗА АПОШНІ ЧАС, МАЙСТАР РЫЧАРД».
«БРУС АДПАЧЫВАЕ?»
«ТАК, СЭР».
«КОЛЬКІ ПАТРАБУЕЦЦА СЁННЯ, КАБ ЯГО УСЫПІЦЬ...?»
«...АЛЬФІ?»
«5 МІЛІГРАМ».
«ПЯЦЬ? ДЫ ГЭТА Ж ПАВАЛІЦЬ НА ДОЛ...»
«Я ВЕДАЮ ПРА ЭФЕКТ, МАЙСТАР РЫЧАРД. БАЮСЯ, Я ПАВІНЕН ВЯРНУЦЦА ДА СВАІХ АБАВЯЗКАЎ. І КАЛІ ВАМ БОЛЬШ НІЧОГА НЕ ТРЭБА...»
БРУС? ТЫ ЎЖО ПРАЧНУЎСЯ?
НУ ЦЯПЕР УЖО ЎСЁ НА СВАІМ МЕСЦЫ.


АНАЛІЗ РЭШТКАЎ.
АНАЛІЗУЮ... МЕТАМОРФІЯ...
МЕТАМОРФІЯ? ПРАЦЯГВАЙ.
ПРАЦЯГВАЮ АНАЛІЗ...
КАЛІ ТЫ ЗАРАЗ ЖА НЕ ПРАДСТАВІШ МЯНЕ СВАЙМУ СЯБРУ, ГЭТА БУДЗЕ БРЫДКА З ТВАЙГО БОКУ.
ГЭТА НЕ СЯБР.
ГЭТА ЧАСТКА СЯМ'І.
МОЙ ПРАПРАПРАДЗЕД, АЛАН УЭЙН.
ЧАЛАВЕК, ЯКІ СТВАРЫЎ АБЛІЧЧА ГОТЭМА. І НАВОШТА ЁН ТАБЕ?
ПРАЦУЮ НАД АДНОЙ СПРАВАЙ.
ТРЭБА ДАПАМОГА?


НЕ.
КАМПУТАР, АНАЛІЗУЙ.
ПРАЦЯГВАЮ АНАЛІЗ...
Я СУСТРАКАЎСЯ З КАМІСАРАМ ГОРДАНАМ, МЫ ПРОСТА ПАГУТАРЫЛІ... ЁН РАСКАЗАЎ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА.
ПОШУК СХОВІШЧАЎ САВІНАГА СУДА. ЁН ЛІЧЫЦЬ, ШТО ДАТЫ САПРАЎДНЫЯ.
Я ЯШЧЭ НЕ СКОНЧЫЎ НЕКАТОРЫЯ ТЭСТ, АЛЕ ТАК, ЯНЫ МНЕ ТАКСАМА ЗДАЮЦЦА САПРАЎДНЫМІ. АЛЕ Я ДАГЭТУЛЬ НЕ ЎПЭЎНЕНЫ.
АБ ГЭТЫМ ЁН ТАКСАМА ЎЗГАДВАЎ. ВЕДАЕШ, ЁН ЛІЧЫЦЬ, ТЫ ЗАНАДТА СКЕПТЫЧНЫ ПА ГЭТАЙ НАГОДЗЕ.
ЁСЦЬ СПОСАБЫ ПАДМАНУЦЬ НАВАТ САМЫЯ ДАСВЕДЧАНЫЯ ПРАГРАМЫ ПА ВЫЯЎЛЕННІ ДАТЫ ПРАЗ УГЛЕРОДНЫ АНАЛІЗ. ТЫ САМ ПРА ГЭТАЕ ВЕДАЕШ.



ТАК... А ЯШЧЭ Я ВЕДАЮ, ШТО ТЫ ЗАНАДТА ШМАТ ПРАЦУЕШ ДЛЯ АДНАГО ЧАЛАВЕКА. ТЫ БЫЦЦАМ АПАНТАНЫ... АБО БОЛЬШ АПАНТАНЫ, ЧЫМ ЗВЫЧАЙНА... І ТАМУ НЕ БАЧЫШ КАРЦІНЫ ЦАЛКАМ СЯРОД ДЭТАЛЯЎ.
АНАЛІЗ АМАЛЬ ЗАВЕРШАНЫ...
ПРАЦЯГВАЙ.
СПРАВА Ў ТЫМ...
ПАЧАКАЙ. Я РАЗМАЎЛЯЮ З КАМПУТАРАМ.
КАМПУТАР...
МЫ ХВАЛЮЕМСЯ ЗА ЦЯБЕ, БРУС.
УЖО ДВОЙЧЫ ЗА МЕСЯЦ ТЫ БЫЎ БЛІЗКІ ДА СМЕРЦІ, І ХТОСЬЦІ З НАС ЛІЧЫЦЬ, ШТО ГЭТА З-ЗА ТАГО, ШТО ТЫ НЕДААЦЭНЬВАЕШ СУПЕРНІКА.
ГЭТА ДЖЫМ СКАЗАЎ?
ТАК, ЁН. НЕВЯДОМЫ, ЯКІ ПАДЫХОДЗІЎ ДА МЯНЕ... ЗАГІНУЎ АД РУКІ ЗАБОЙЦЫ, ЯКІ КЛІЧА СЯБЕ КІПЦЮРОМ.
ГЭТЫ ХЛОПЕЦ ЗВАЛІЎСЯ З ВЯЛІКАЙ ВЫШЫНІ, А Ў ТОЙ ЧАС ЯК ЯГО ВЕЗЛІ Ў МОРГ, ЁН УСТАЎ І ЗАБІЎ УВЕСЬ ЭКІПАЖ «ХУТКАЙ». ЦЯПЕР ТЫ ЗНАЙШОЎ ІХ СХОВІШЧЫ Ў БУДЫНКАХ УЭЙНАЎ...
...ЯКІЯ З'ЯЎЛЯЛІСЯ КОЖНАЕ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ, ПАЧЫНАЮЧЫ З ДЗЕВЯТНАЦЦАТАГА СТАГОДДЗЯ. ЯК ТЫ МОЖАШ НАВАТ ТРОШКІ НЕ АСЦЕРАГАЦЦА ТАГО, ШТО МОЖАШ АПЫНУЦЦА НАСУПРАЦЬ АДВАРОТНАГА БОКУ ЗНАКА ПАДАБЕНСТВА?
Я ПРОСТА АБ'ЕКТЫЎНЫ, ДЗІК. ЯКІМ І ВУЧЫЎ БЫЦЬ ЦЯБЕ.
КАМПУТАР, ЗАПУСКАЙ ДРУГАСНЫ ТЭСТ НА СЛАНЕЦ.
ПАЧЫНАЮ...
БЕРАЖЫ СЯБЕ, БРУС. У МЯНЕ – САМАЛЁТ


ДЗІК...
САВІНЫ СУД НЕ ІСНУЕ. Я ВЕДАЮ, ТАМУ ШТО Я ЎЖО ШУКАЎ ІХ.
КАЛІ? Я НІЧОГА ПРА ГЭТА НЯ ВЕДАЮ, ХОЦЬ І ЖЫЎ ТУТ...
ГЭТА БЫЛО ДАЎНО. КАЛІ Я БЫЎ ДЗІЦЁМ.
АНАЛІЗ ЗАВЕРШ...
ЦІШЭЙ.
ПАЎЗА.
ГЭТА ЗДАРЫЛАСЯ ПАСЛЯ СМЕРЦІ МАІХ БАЦЬКОЎ.
У ПЕРШЫЯ ТЫДНІ ПАСЛЯ ІХ ЗАБОЙСТВА...
«Я БЫЎ... СПУСТОШАНЫ».
«Я НЕ МОГ ЗМІРЫЦЦА З ГЭТЫМ».
«ТЫ БЫЎ ДЗІЦЁМ, БРУС. І Я БЫЎ ГЭТКІМ ЖА. ЯК МОЖНА БЫЛО ЗМІРЫЦЦА...»
«НЕ, ДЗІК...»
«...Я НЕ МОГ ЗМІРЫЦЦА З ТЫМ, ШТО ГЭТА БЫЛО ВЫПАДКОВА».
«ШТО ДЖО ЧЫЛ ЗАБІЎ МАІХ БАЦЬКОЎ ПРОСТА ДЗЕЛЯ РАШТЫ І ЖЭМЧУГА».
«ШТОСЬЦІ МНЕ ПАДКАЗВАЛА... НЕ, Я ВЕДАЎ... ЗА ГЭТЫМ ХАВАЛАСЯ НЕШТА БОЛЬШАЕ».



«Я, КАНЕШНЕ Ж, ЧУЎ СТАРУЮ ЛЕГЕНДУ ПРА САВІНЫ СУД».
«Я ПЫТАЎ ПРА ЯЕ Ў БАЦЬКІ, АЛЕ ЁН ТОЛЬКІ ЖАРТАВАЎ У АДКАЗ».
«АДНАК, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ГЭТА, ЗА НЕКАЛЬКІ ДЗЁН ДА СМЕРЦІ БАЦЬКОЎ З'ЯВІЎСЯ ЗНАК».
«ГНЯЗДО. САВІНАЕ ГНЯЗДО НА ГАРЫШЧЫ. ЁН ГНАЎ ПТУШАК, АЛЕ ЯНЫ ВЯРТАЛІСЯ».
«У СТАРОЙ ВЕРСІІ ПАДАННЯ ЁСЦЬ РАДКІ ПРА ЗНАКІ, ПРАДВЕСЦІ СУДА».
«ПАСЛЯ ІХ СМЕРЦІ Я ПРЫНЯЎ ГНЯЗДО ЗА ЗНАК, ЗА ПАПЯРЭДЖАННЕ. ЯКОЕ МАЕ БАЦЬКІ НЕ ЗАЎВАЖЫЛІ Ў ЧАС».
«ТАДЫ, НА ТЫМ МЕСЦЫ, Я ПАКЛЯЎСЯ АДПОМСЦІЦЬ».
«Я БЫЎ ПРОСТЫМ ХЛОПЧЫКАМ, АЛЕ Я ЗНАЙШОЎ ІХ – САВІНЫ СУД – І Я Б ВЫКРЫЎ ІХ. ЗНІШЧЫЎ ІХ СВЕТ ТАК ЖА, ЯК ЯНЫ ЗНІШЧЫЛІ МОЙ».




«ТАКІМ ЧЫНАМ ПАЧАЛІСЯ МАЕ ЎЛАСНЫЯ ПОШУКІ СУДА. І ГЭТА БЫЎ МОЙ ПЕРШЫ ДОСВЕД У ЯКАСЦІ ДЭТЭКТЫВА».
«Я ВЕЛЬМІ ЖАДАЎ РАЗГАДАЦЬ ГЭТУЮ ТАЯМНІЦУ».
«Я АДРАЗУ Ж ПАЧАЎ АДШУКВАЦЬ КЛЮЧЫ ДА РАШЭННЯ».
«ЦЯГАМ ПЭЎНАЙ КОЛЬКАСЦІ ДЗЁН Я АДШУКВАЎ НОВЫЯ ЗНАКІ, РОЗНЫЯ ДОКАЗЫ, ЯКІЯ ПАЦВЯРДЖАЛІ ІСНАВАННЕ СУДА».
«ТАКІМ ЧЫНАМ Я ПРАСОЎВАЎСЯ НАПЕРАД».
«КАЛІ СУД СКЛАДАЎСЯ З УПЛЫВОВЫХ СЯМЕЙ ГОТЭМА, ТО ЛЕПШАЕ, ШТО Я МОГ ЗРАБІЦЬ, ГЭТА САЧЫЦЬ ЗА СЯБРАМІ МАІХ БАЦЬКОЎ І ІХ ДЗЕЛАВЫМІ ПАРТНЁРАМІ».
0 1 2 3 MI.
ГОТЭМ



«НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ПРАЦУ ЛЕКАРА, МОЙ БАЦЬКА БЫЎ ВЕЛЬМІ ЗАНЯТЫ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СТРУКТУРАЙ ГОТЭМА. ЁН ЗАЙМАЎСЯ НЕ ТОЛЬКІ ДАБРАЧЫННАСЦЮ, АЛЕ І БЫЎ ЗЛУЧАНЫ З УСІМ – АД МУЗЕЯЎ ДА ГАРАДСКОЙ ВЕРФІ».
«ЛЮБЫ МОГ БЫЦЬ УДЗЕЛЬНІКАМ СУДА. ЛЮБЫ БЕЗ ВЫКЛЮЧЭННЯЎ».
«ЗА НЕКАЛЬКІ ТЫДНЯЎ Я СКЛАЎ ДАСЬЕ НА НЕКАТОРЫЯ НАЙУПЛЫВОВЫЯ СЕМ'І ГОТЭМА. НА МАЮ ДУМКУ – ДУМКУ ХЛОПЧЫКА-ДЭТЭКТЫВА, УСЁ ЗВОДЗІЛАСЯ ДА АДНАГО – СУПРАЦЬ МАЁЙ СЯМ'І БЫЛА ЗМОВА, І ЦЯГНУЛАСЯ ЯНА ДОЎГІ ЧАС».
«Я НАВАТ ЗНАЙШОЎ ІХ СХОВІШЧА... СТАРЫ ЗАКІНУТЫ КЛУБ, З УПРЫГОЖВАННЕМ НА ВЫСТУПЕ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ДЗВЮХ СОЎ. ГЭТАЕ МЕСЦА ЗВАЛАСЯ ПАРТОВЫМ ДОМАМ. ЯНО БЫЛО...»
«Я ГЭТА ВЕДАЮ».
«Я ПАДАЗРАВАЎ, ШТО ЎСЕ СЕМ'І, У ТОЙ ЦІ ІНШЫ ЧАС, УВАХОДЗІЛІ Ў СКЛАД КЛУБУ».
«І НА СХЕМАХ Я ЗНАЙШОЎ ПАКОЙ У ВЕРХНЯЙ ВЕЖЫ – НЕШТА ПАДОБНАЕ НА ПАКОЙ ДЛЯ СУСТРЭЧ БЕЗ ВОКНАЎ. ПАКОЙ ЗНАХОДЗІЎСЯ АДРАЗУ НАД ВЫСТУПАМ ЗВОНКУ».



«Я БЫЎ УПЭЎНЕНЫ, ШТО ГЭТА ТОЕ МЕСЦА».
«Я ЗНАЙШОЎ САВІНЫ СУД. ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ ДАТЫЧЫ-ЛІСЯ СМЕРЦІ МАІХ БАЦЬКОЎ».
«АДНАК ТОЕ, ШТО Я НА САМОЙ СПРАВЕ ЗНАЙШОЎ...»
«...ТАМ, У ПАТАЕМНЫМ ПАКОІ, БЫЛО ЗНАЧНА БОЛЬШ СТРАШЭННА...»



«...АД ПЫЛУ»
«НІЧОГА. НІ АДКАЗАЎ. НІ ЗЛОДЗЕЯЎ».
«ЗВЫЧАЙНЫ СТАРЫ ПАКОЙ, ЯКОЙ НЕ КАРЫСТАЛІСЯ ШМАТ ГАДОЎ».
«Я БЫЎ НАСТОЛЬКІ ЗДЗІЎЛЕНЫ, ШТО НЕ ЗАЎВАЖЫЎ ЯК ЗАЧЫНІЎ СВАЁЙ НАГОЙ ДЗВЕРЫ».
«Я ЗАТРЫМАЎСЯ ТАМ НА ЦЭЛЫ ТЫДЗЕНЬ».
«КАЛІ АЛЬФРЭД ЗНАЙШОЎ МЯНЕ, Я БЫЎ КОМЕ».


Я ТРЫ ТЫДНІ ПРАВЁЎ У ШПІТАЛІ, ПАКУЛЬ ПРЫЙШОЎ У СВЯДОМАСЦЬ.
КАЛІ Я АЧУЎСЯ, Я ЗАСВОІЎ УРОК. УРОК, НА ЯКІМ Я ПАБУДАВАЎ СВАЕ НАВЫКІ ДЭТЭКТЫВА.
НІКОЛІ НЕ ДАЗВАЛЯЙ ПАЧУЦЦЯМ АВАЛОДАЦЬ ТАБОЙ.
Я МЕЎ ПАТРЭБУ Ў САВІНЫМ СУДЗЕ. НЕЙКІМ ВЯЛІКІМ ЗЛЕ, ЯКОЕ СТАЯЛА ЗА ЗАБОЙСТВАМ МАІХ БАЦЬКОЎ. Я ДАЗВОЛІЎ СВАІМ ПАЧУЦЦЯМ КІРАВАЦЬ МАІМ РАССЛЕДАВАННЕМ, І ГЭТА ЛЕДЗЬ НЕ ЗАБІЛА МЯНЕ.
ТЫ БЫЎ ДЗІЦЁМ, БРУС.
З ТЫХ ЧАСОЎ Я СПРАБАВАЎ ІЗНОЎ ЗНАЙСЦІ СУД, АЛЕ ЗАЎСЁДЫ ЗАСТАВАЎСЯ НІ З ЧЫМ.
АДНАК НАКОЛЬКІ СТАРАННА ТЫ ШУКАЎ?
ШЧЫЛЬНЕЙ, ЧЫМ ТАГО ПАТРАПАВАЛІ ДОКАЗЫ.
ТАМУ ШТО НІЯКІХ ДОКАЗАЎ НЕ БЫЛО.
СЛУХАЙ, БРУС. НІХТО НЕ ВЕДАЕ ГОТЭМ ЛЕПШ ЗА ЦЯБЕ. ГЭТА ТВОЙ ГОРАД. ГОРАД БЭТМЭНА...


«...АЛЕ ГОТЭМУ АМАЛЬ ЧАТЫРЫ СОТНІ ГАДОЎ. А ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, ШТО ДА ЦЯБЕ ЁН МОГ ДОЎГІ ЧАС НАЛЕЖЫЦЬ НЕЧАМУ ІНШАМУ. НЕЧАМУ ВЯЛІКАМУ І ЦЁМНАМУ».
«МНЕ ТРЭБА ІСЦІ».
«МНЕ ТРЭБА ШТОСЬЦІ ЗРАБІЦЬ».


Мой прапрапрадзед Алан Уэйн пабудаваў некаторыя з найвысокіх будынкаў горада.
Яго аголенае цела было знойдзена тут, у каналізацыі. Труп знаходзіўся тут так доўга, што Алана змаглі апазнаць толькі па па пломбах на зубах.
Жудасны канец для чалавека, які большую частку жыцця падымаў Готэм увышыню: патануць глыбока пад горадам у сцёкавых водах.
У брудкай крыві горада, які ён дапамагаў стварыць.
Аднак усё ж такі ёсць спосабы памерці і горш.
Напрыклад такім чынам, якім ён загінуў на самой справе. Даследуючы яго цела, я знайшоў малюсенькія адтуліны, падобныя на колатыя раны, у яго касцях. Шмат такіх адтулін.
Значыць, ён быў заколаты, хутчэй за ўсё, кідальнымі нажамі.
Іх было амаль пяцьдзесят.


АДНАК Я ЗНАЙШОЎ НЕШТА ЯШЧЭ НА ЯГО КАСЦЯХ.
УЛЯГАННІ.
ПЫЛ АД МЕТАЛАМАРФІЧНЫХ ПАРОД. ПАДОБНАЯ НА МАРМУР.
ДЗІЎНА, УЛІЧВАЮЧЫ, ШТО КАНАЛІЗАЦЫЙНАЯ СІСТЭМА ПРАКТЫЧНА ЦАЛКАМ СКЛАДАЕЦЦА З ГРАНІТУ.
АЛЕ ГЭТА ГОТЭМ. ЁН НІКОЛІ НЕ ПЕРАСТАЕ...


«СЦЕРАЖЫЦЕСЯ САВІНАГА СУДА, ЯНЫ СОЧАЦЬ ЗА ВАМІ».
«І КІРУЮЦЬ УСІМІ З ЦЕНІ, СЕДЗЯЧЫ ЗА ЗА ДУЖЫМІ СЦЕНАМІ».
«ЯНЫ СОЧАЦЬ ЗА ВАМІ ЎСЮДЫ».
«У ЛОЖКУ ДОМА, НА ПРАЦЫ...»
«...ПРА ІХ НЕ ЎЗГАДВАЙЦЕ ТАМ, ДЗЕ ШМАТ ЛЮДЗЕЙ...»
«...ІНАЧАЙ ПРЫШЛЮЦЬ ЗА ВАМІ КІПЦЮРА!»



БЭТМЭН! САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ У ЛАБІРЫНТ!
DC COMICS presents
BATMAN in
СУСТРЭЧА З СУДОМ
SCOTT SNYDER writer
GREG CAPULLO pencils
JONATHAN GLAPION inks
FCO colors
RICHARD STARKINGS & COMICRAFT'S JIMMY BETANCOURT lettering
CAPULLO & FCO cover • variant cover MIKE CHOI
KATIE KUBERT assistant editor
HARVEY RICHARDS associate editor
MIKE MARTS editor
BATMAN CREATED BY BOB KANE